**249.** Прачытайце прыказкі. Спішыце іх, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак. Растлумачце правапіс мяккага знака.

1. Верасок і ў цян..ку зац..вітае. 2. Бол..ка доктара шукае. 3. І на здаровай яблын..цы гнілы яблык[ф] знойдзеш. 4. І няўмел..ка пяе, калі голасу стае. 5. Кропел..кай мора не напоіш. 6. І кругламу камен..чыку ў падмурку месца будзе. 7. Усякая зязюл..ка пра сваё кукуе.

**250.** Прачытайце верш.

Страціў слова, страціў спадчыннае слова —
Штосьці страціў у душы абавязкова!
Можа — годнасці хоць кропельку малую?
Можа — мудрасці хоць дробачку якую?
Можа — памяці хоць зернетка-іскрынку?
Можа — праўды хоць пылінку-парушынку?
Я не ведаю дакладна, што ты страціў.
Запытайся, ці не скажа табе маці...

*Н. Гілевіч.*



Выпішыце з тэксту назоўнікі з памяншальна-ласкальным значэннем, абазначце суфіксы.

Падбярыце антонім да слова *страціць.*

Выпішыце з тэксту абстрактныя назоўнікі.

## § 41. Складаныя назоўнікі, іх правапіс

**251.** Прачытайце тэкст. Якія словы і выразы перадаюць асаблівасці казкі як жанру мастацкага стылю?

За трыдзевяць зямель, у трыдзясятым царстве-гаспадарстве плавае па моры-акіяне кіт. Кіт — незвычайны вадалюб. Завуць яго Велярыб. Пачуў ён лямант, які ўзнялі паны, і пытаецца:

— Чаго паны раскрычаліся?

— Няхай пан кіт пакаштуе вунь таго быка, што пасецца на ўзгорку, — паважна запрашае пан Кубліцкі.

— А потым мы пана кіта засмажым і з'ямо, — дадае пан Заблоцкі.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі



Велярыб выслухаў гэтыя прапановы, чорным вокам аглядае паноў і быка, запускае пад воблака вадзяны струмень, як вадакачка, і дае адказ:

— За пачастунак — дзякуй, але такога мы, кіты, не ямо. Зубы не тыя. Ешце, панове, самі вашага быка. А мне б што-небудзь далікатнае, чарвячка або рыбку... — і кіт паварочвае назад да мора *(Паводле П. Васючэнкі)*.

Знайдзіце ў тэксце складаныя назоўнікі. Размяркуйце і запішыце іх па групах у залежнасці ад спосабу ўтварэння: 1) словаскладанне; 2) асноваскладанне; 3) складана-суфіксальны спосаб.

Якія выразы выкарыстоўвае кіт, каб адмовіць панам у іх просьбе? Чаму важна ў такіх выпадках быць ветлівым?

**!**

Складаныя назоўнікі пішуцца разам і праз злучок.

Разам пішуцца назоўнікі:

- утвораныя шляхам спалучэння дзвюх і больш асноў з дапамогай злучальных галосных: *снегаход, галалёд, законапраект*;
- першай часткай якіх з'яўляюцца іншамоўныя асновы ***авія-, аўта-, кіна-, касма-, тэле-, мота-, фота-, электра-, радыё-***: *авіяканструктар, фотаальбом, касмаграфія, электраток, тэлеграма, фотакалаж, радыёперадача.*

**252.** Вызначце, якім спосабам утвораны словы. Растлумачце іх лексічнае значэнне.

Рыбалоў, канькабежац, байкапісец, сарвігалава, тэлеглядач, ардэнаносец, кнігалюб, касмафізік, авіямадэліст, кінагерой, радыёдыджэй.

Падбярыце прыметнікі, якія характарызавалі б названых асоб. Запішыце словазлучэнні.

**253.** Спішыце, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Ударылі непадалёк ад Гомеля магутныя ч..рныя ф..нтаны. Радаваліся тапографы, *(перша)*праходцы-г..олагі, *(геа)*фізікі, бурыльшч..кі, калі знайшлі д*(о, а)*ўгачаканую гарываду. Цяпер

ім *(у, ў)*ся Беларусь дзякуй кажа. Вырабляюць з г..ручай вады бензін, салярку, масла ды яшчэ тыс..чы розных рэчываў. А гарываду нафтай называюць *(Паводле А. Караленкі)*.

Знайдзіце ў тэксце слова, якое мае значэнне ‘*спецыяліст, які праводзіць вымярэнні і апісвае зямную паверхню*’.

**!** П р а з з л у ч о к пішуцца назоўнікі:

- утвораныя ад двух самастойных слоў без злучальнай галоснай: *папараць-кветка, горад-герой, жар-птушка*;
- з першай часткай ***вэб-, міні-, максі-, мідзі-***: *вэб-камера, міні-ансамбль, максі-мода, мідзі-спадніца*;
- складаныя прозвішчы і геаграфічныя назвы: *Буда-Кашалёва, Санкт-Пецярбург, Дунін-Марцінкевіч*.

**254.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Сёлета буслíная сям’я павялічылася ў тры разы — вывелася ажно чацвёра *(птушаняты)*. Бусел*(?)*тата і бусліха*(?)*мама даглядаюць дзяцей, стараюцца не абдзяліць ніводнага *(бусляня)*. Аднаму ў разяўлены рот — жабяня, другому — рыбку, трэцяму — травінку*(?)*раслінку. Вырашыў я ім дапамагчы. Калі бусел з бусліхай паляцелі на пошукі ежы, залез на страху і ўладкаваў ля гнязда каструлю з рыбай, што раніцай налавіў *(Паводле І. Муравейкі)*.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ставячы назоўнікі ў патрэбную форму. Растлумачце правапіс складаных назоўнікаў.
Падкрэсліце словы, у якіх літары ***е, я, і*** абазначаюць два гукі.
Вусна перакажыце тэкст. Дапоўніце яго паведамленнем пра тое, як буслы аддзячылі за дапамогу.

**255.** Утварыце рознымі спосабамі складаныя назоўнікі. Растлумачце іх правапіс.

Хлеб + рэзаць, лес + стэп, плацеж + здольнасць, гук + запіс, лісце + падаць, кіно + сцэнарый, шафа + купэ, генерал + лейтэнант, мароз + устойлівасць, сок + выціскаць, кава + варыць, жыццё + любіць.

Запішыце ўтвораныя назоўнікі, вызначце спосаб утварэння слоў.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі